# Аб мове, народзе і друку ў роднай мове (з поваду 20-х угодкаў беларускае прэсы)

Беларуская кніжка ці газета цяпер ужо не дзіва, але да вайны дык напэўна, што ня толькі ніхто не бачыў беларускага друку, але нават ня чуў аб ім. Ад гэтуль паўстала адʼёмнае адношаньне да беларускага друкаванага слова і да беларускае мовы наагул. Уся навука вялася паміж нас па руску або па польску з няма ведама якіх часоў, з прычыны чаго мы прывыклі былі лічыць уменьне ўжываць рускую ці польскую мову за адзнаку культурнасьці, інтэлегентнасьці, і наадварот, ужываньне беларускае, простае і мужыцкае мовы ўважалі за адзнаку цемнаты, хамства і г[этак] д[алей]. Дык не дзіва, што гэткія думкі укараніліся ў нас моцна і шмат хто, пабачыўшы ці пачуўшы аб беларускім друку, пачаў адносіцца да яго варожа, бо думка аб друку ў беларускай мужыцкай мове здалася не мала каму як адзнакай барбарызацыі, сеўбы цемры і г[этак] д[алей].

Гэта было не вельмі даўно, але цяпер ужо мы бачым не тое; цяпер ужо не гэтак варожа ўзіраюцца на беларускую кніжку і газэту, а нават шмат хто раптам загарэўся гарачаю прыхільнасьцю да яе. Вітаючы гэтую зьяву, нам астаецца толькі высьветліць даўнейшую памылку, якая і цяпер яшчэ мо каго смучае.

Культурнасьць, інтэлегентнасьць і г[этак] д[алей] залежыць не ад таго, якую мову ўжывае чалавек, бо моваў ёсьць не адна і не дзьве, але тысячы. Спаміж розных народаў, ужываючых розныя мовы, ёсьць культурнейшыя і некультурныя, нават зусім дзікары, дзеля гэтага мова адных вельмі значная ў культурным жыцьці, а мова другіх нічога не значыць.

Ад гэтуль і паўстае шмат ў каго памылковая думка аб тым, што ўжываньне тае ці іншае мовы ёсьць адзнака культурнасьці ці не культурнасьці. Калі ж гэта прыняць за агульную праўду, дык прыйдзецца ўсім народам, колькі іх ёсьць на сьвеці, адказацца ад сваіх моваў і ужываць мову нямецкую, бо немцы ў нашы часы апярэдзілі ўсіх у культуры. Толькі ж гэта з аднаго боку — немагчыма, а з другога боку недарэчна. Дзеля гэтага, тая дзікая “праўда”, быццам ужываньне мовы ёсьць адзнака культурнасьці, зводзіцца з шырокага маштабу да мелачных прыватных “паверʼяў”, прык-

ладам, у данным выпадку ўважаць за лепшую мову рускую ці польскую перад беларускаю, бо ў рускай і польскай мове разьвівалася культура больш, як ў беларускай.

Гэта праўда, але калі мы да гэтае праўды аднясемся крытычна без прыватных павер'яў адносна мовы і інтэлегентнасьці, то нам высьветліцца шмат што, аб чым мы нават не думалі.

Каб зразумець тое, чаму, напрыклад, руская мова больш культурная, як беларуская, дык нам прыдзецца зрабіць некалькі гістарычных і сацыяльных увагаў, якія пакажуць нам праўду. Мы ўбачым, што заняпад беларускае мовы залежыць не ад мовы, г[эта] з[начыць] не ад таго, што яна мужыцкая, хамская і г[этак] д[алей], але ад інакшых прычынаў. Каб жа беларуская мова апынулася ў інакшых варунках, як тыя, ў якіх яна была, дык тады ў мове 12-ці мільённага народу мы напэўна атрымалі б вялікія здабыткі культуры.

Ў XV—XVI стагодзьдзі, у часе існаваньня Літоўска-беларускага князьства ў беларускай мові гаварылі князі і паны, пісалі законы. У той час быў у беларусаў доктар Францішак Скарына[1] з Полацку, які пачаў друкаваць беларускія кніжкі раней, як пачаліся друкавацца рускія кніжкі больш як на 50 гадоў, бо першая друкаваная беларуская кніжка выйшла ў сьвет у 1517-м годзе у Празе чэскай, а першая беларуская друкарня 1525 гаду была заложана ў Вільні, у той час, калі расейскія кніжкі пачаліся друкавацца ў Львове, Заблудаве, ў Маскве неяк 1570—80-х гадох.

Беларуская біблія (найбольш цэннае выданьне тых часоў), надрукаваная Францішкам Скарынай, зьявілася трэцяй у сьвеці, пасьля нямецкай і чэскай. Каб пайшло так і далей, дык цяпер беларуская мова была б прынамсі на роўні з польскаю, калі не вышэй за яе.

Але вінаваты ў заняпадзе беларускае мовы Люблінская вунія[2], калі літоўскі князь Ягелло[3] ажаніўся з польскай каралеўнай Ядвігай[4] і злучыў Літоўска-беларускае князьства з Польскім каралеўствам. Пасьля гэтага паступова пачалі пераходзіць ў каталіцтва літоўска-беларускія паны, прымаючы разам з ім польшчыны і пакідаючы гэткім чынам беларускую мову, якая ўрэшці засталася ў адных мужыкоў, дзеля чаго і празвалі яе мужыцкаю.

Дык як бачым, мужыцкаю яна стала не ад таго, што была нягоднаю для культурнага разьвіцьця, а дзеля таго, што

паны-шляхта здрадзілі яе і пакінулі яе мужыком, а мужыкі ў той час, ведама, не тварылі ніякае культуры, толькі працавалі на паноў, дык з гэтае прычыны і аказалася наша мова не культурнаю, простаю, мужыцкаю.

Цяпер жа мінулі тыя часы, калі адны паны–шляхта тварылі культуру, цяпер ужо пачынаюць тварыць культуру і працоўныя людзі: мужыкі, рабочыя і г[этак] д[алей], якія напэўна ў хуткім часе аперадзяць усех паноў, бо іх большая сіла.

У гэты час, калі народ сам пачынае тварыць культуру, калі нават найбольш цёмны і пасыўны беларускі народ пачынае варушыцца і самастойна думаць, у гэты час адкрываецца новы шлях для разьвіцьця культуры ў беларускае мові.

Нам даводзіцца чуць, што мова беларуская брыдкая, бедная, мужыцкая і г[этак] д[алей]. Адным словам — зусім непрыгодная для таго, каб мецьь культурная разьвіцьце. Кажучыя гэта, ці думаючыя гэтак, пэўня, лічаць, што культуру трэба разьвіваць ў "культурных" мовах, што "інтэлегенту" трэба гаварыць "інтэлегентнай" мовай і г[этак] д[алей]. Але няхай будзе ведама ўсім, хто так думае і гаворыць, што культурнасьць і інтэлегентнасьць даецца не тым, якую мы мову ўжываем, а тым, сколькі ёсьць ў нас ў галаве крытычных паняцьцяў і праўдзівых пачуцьцяў. Няхай хто гаворыць хоць расейскаю мовай, але калі ў яго ў галаве абсурд, ці клоча замест мазгоў, дык напэўна такі чалавек ужо не можа быць культурным.

Толькі ясная і разумнае паняцьце аб усіх рэчах і праявах жыцьця дае чалавеку не назву культурнасьці, а запраўдную культурнасьць.

У бел[арускім] адрыўным календары на гэты год ёсьць вельмі цікавая стацейка "Культура" і культура", дзе пішацца вось што:

"Беларускі народ лічаць некультурным, бо ён, як ведама, ніколі не заваёўваў другіх, не забіраў чужой зямлі, ані панаваў над іншымі народамі. Апроч таго яшчэ народ гэты рамансаў не піша і французкіх хваробаў не ведае — а ўсё ж гэта маюць культурныя народы.

Праўдзівая культура ёсьць у тым, што народ жыве сумленнай працай, ідзе за жыцьцём, не гвалцячы прыроды.

Маральнасьць і духовая чыстата ў сямейным жыцьці, Бог ў сэрцы і штодзённым жыцьці, а не ў паходах на наказ.

Любоў да ўсяго роднага: мовы, звычаяў, песьні — усяго гэта ёсьць падставай праўдзівай культуры”.

Да гэтых пекных слоў аб культуры няма чаго дадаць, астаецца толькі крытычна высьветліць: чаму гэта праўда? Чаму праўда ў гэтым, а не ў тым, быццам культура гэта ёсьць больш-меньш пашыраная вядомасьць мовы?

Каб адказаць на гэтыя пытаньні, нам трэба зразумець: што такое мова? Нам часта даводзіцца чуць, што беларуская мова, напрыклад, непекная і г[этак] д[алей]. Можа, гэта й так, калі прымеш пад увагу тое, што беларуская мова ў працягу даўжэйшага часу не мела культурнага разьвіцьця і г[этак] д[алей], але чым жа вінаваты беларускі народ, у тым, што у яго гэткая, а не інакшая мова?

Гэта яго прыродны скарб, які ён атрымаў ад свае прыроды, ад сваіх продкаў, дык ў гэтым такжа мала яго віны, як мала можа быць яго годнасьці.

Так сама і іншыя культурныя народы зусім не могуць гардзіцца прыгожасьцю сваіх моваў, бо вартасьць чалавека ў тым, што ён творыць, але не ў тым, што ён не атрымлівая. Мы можам шанаваць эсперанцістаў за іхнюю мову, бо яны твараць гэтую мову ўзамен ўсіх моваў, існуючых на сьвеці і раз’яднаючых людзей. Яны хочуць правядзеньнем адзінае мовы аб’яднаць усе народы, дык яны твараць новую агульную мову. Але тое, што чалавек атрымлівае, нельга лічыць ягонаю вартасьцю. Гэта, калі хочаце, можна лічыць шчасьцем, як тое, што чалавек знойдзе грошы, або згубіць іх — толькі ўжо ніяк нельга лічыць вартасьцю ці заганаю чалавека.

Дык кожны, хто лічыць вартасьцю, ці заганаю чалавека ягоную мову, зьяўляецца сяўцом цемры, ілжывых думак і паняцьцяў паміж людам. Кожны хто адракаецца свае мовы, каб прыняць іншую, больш “культурную“ мову, гэтым самым робіць сябе “здраднікам” культуры, бо культурны чалавек не той, хто атрымлівае яе з чужых рук, а той, хто яе сам сваімі рукамі тварыць і здабывае. Дык кожны, хто ухіляецца свае простае мужыцкае мовы, гэтым паказвае, што ён не хоча працаваць на тым полі, якое найбольш вымагае працы і ідзе туды, дзе працаваць ня трэба.

Дык вось, культурнасьць мовы залежыць не ад таго, якая вялікая культурная спадчына дасталася нам ў гэтай мове, але ад таго, сколькі ёсьць людзей, ахвочых вясьці культурную працу ў гэтай мове. I каб нават адзін чалавек пажадаў вясьці культуру ў тэй мове, якая усімі паганьбавана,

дык тым шырэйшы грунт для сваей працы ён знайшоў-бы, тым вялікшыя плады яго працы маглі-бы быць.

Такую вялікую працу распачаў сп[адар] Іван Луцкевіч[5], які 20 гадоў назад залажыў першую легальную беларускую газэту і пасьля вяковага заняпаду беларускае мовы разпачаў яе разьвіцьце. За 20 гадоў працы ў кірунку, распачатым ім, мы бачым вялікія пасьпехі, бо беларуская культура пачала нанова тварыцца, дык кожны сьвядомы і дзейны беларус можа прылажыць сваю працу і прынясьці вялікую карысьць. І гэткіх дзейных сьвядомых людзей паміж нашага народу знаходзіцца ўсё больш і больш, і нават тут, дзе яшчэ які тры гады назад, мала хто цікавіўся беларускаю культураю, мы цяпер маем магчымасьць адсьвяткаваць 20-е ўгодкі беларускага друку, як пачатак адраждджэньня беларускае культуры і беларускага народу.

Дык калі паміж народу беларускага знойдуцца гэніі сусьветнае вялічыні, як Гогаль[6], Достаеўскі, Чэхаў[7] і г[этак] д[алей]. Тады з беларускаю моваю будуць лічыцца ўсе культурныя народы, як цяпер лічацца з рускаю. А сто гадоў назад руская мова была тое самае, што цяпер беларуская. Толькі гэніі літэратуры зваявалі ёй мейсца ўвагі ў сусьветнай культуры.

Кожны Сын Беларускага народу павінен захапіцца думкамі тых пачынаньняў сваяго Адраждджэньня, каторыя паказалі яму гэтую праўду, якая кажа, што ў творчай працы сьвядомай энэргіі ёсьць залог культуры.

Творчая праца — гэта праца над разьвіцьцем беларускага народу; сьвядомаю энергію дае паняцьце таго, што мы ня можам ганьбаваць ніякаю моваю і ніякім народам, як бы ён ня быў малы ці не культурны.

Тварыць і разумець, што ў творчастві культуры гэта ёсьць запраўды найвялікшы культурны здабытак, і той, хто гэтага не разумее, хоць бы ён стаяў на найвышэйшай ступені культуры, — ідзе да зьдзічэньня.

Гэтым шляхом ідуць тыя, што працівяцца беларускаму культурнаму разьвіцьцю, але беларуская культура пачынае ламаць гэтыя дзікарскія бар’еры і зьдзейсьняе думку тых, хто 20 гадоў назад далі яму сьведамасьць сваяго прыроднага права і абавязку.